НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь, твой народ дачакаецца Залацістага, яснага дня!*
*М. Багдановіч.*

№ 2 (114), ЛЮТЫ 2011 ГОДА

**http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна**

## ПОГЛЯД РЭДАКТАРА

# ЧОРНЫ СПІС ПАТЭНЦЫЙНЫХ ЗЛАЧЫНЦАЎ

19 снежня аўтарытарны рэжым Аляксандра Лукашэнкі кінуў на мірных дэманстрантаў карныя аддзелы войскаў спецыяльнага прызначэння. Агулам былі жорстка збіты, трапілі ў шпіталь, затрыманы і пасаджаны ў турмы звыш шасцісот чалавек. Лукашэнка і яго атачэнне зрабілі ўсё, каб любой цаной утрымаць неабмежаваную ўладу шляхам рэпрэсій супраць беларускага народу. Брутальны напад на людзей быў выкліканы найперш тым, што Лукашэнка на гэты раз не атрымаў той пераважнай большасці галасоў, якой неаднаразова выхваляўся на ўвесь свет. Вялікая колькасць выбаршчыкаў прагаласавала супраць яго. Кола яго электарату няўхільна звужаецца, узурпатар і сам гэта разумее, але ж хвароба на ўладу і страх адказнасці за зламысныя ўчынкі прымушаюць чапляцца за пасаду да апошняга. Каб запалохаць нязгодную з адыёзнай дыктатурай частку народа, рэжым распачаў шырокую хвалю рэпрэсій па ўсёй Беларусі. Запрацаваў судовы канвеер, вельмі падобны на сталінскія тройкі: закрытыя суды без доказаў, без сведкаў, без прысутнасці прадстаўнікоў грамадскасці і журналістаў у залі, без адвакатаў. Прычым пераслед пачаўся не за палітычную дзейнасць, а за любую праяву грамадскай актыўнасці. Студэнтаў пачалі выключаць з універсітэтаў толькі за тое, што яны збіралі подпісы за дэмакратычных канжыдатаў, працоўных сталі пазбаўляць рабочых месцаў за ўдзел у назіранні за выбарамі. Затым прыслужнікі ад журналістыкі стварылі цэлы прапагандысцкі кінафільм “Плошча. Жалезам па шклу”, дзе склеілі новую бязлгуздзіцу пра тое, што апазіцыянеры нібыта самі сябе пабілі, а паэта Уладзіміра Някляева ўвогуле хацелі забіць яго паплечнікі, але міліцыя “абараніла”. Народу хлусяць: дзяржаўнае тэлебачанне, дзяржаўныя газеты, дзяржаўныя ідэолагі, прадстаўнікі прэзідэнцкай вертыкалі. Хлусяць кожны дзень, кожную гадзіну, унутры краіны і за яе межамі. Усё, пасля 19 снежня кропка незваротнасці пройдзена. Рэжым пераступіў тую мяжу, за якой ужо ніколі не выйдзе з бандыцкага кола зла. Цынічная хлусня, самадурства, беззаконне хунты самазванцаў, як ракавая пухліна распаўзаецца па ўсяму народу, мярзотныя метастазы ахопліваюць усё новыя і новыя пласты грамадства. Кучка ўзурпатараў хоча замазаць усіх сваёй граззю, каб было ўсё меней прыстойных людзей. Разгубленае грамадства збянтэжана глядзіць на ўсё гэта, і, здаецца, здольнасці да супраціву ўжо не застаецца. Аднак спосабы ўздзеяння на нахабнікаў яшчэ ёсць – гэта міжнародны ціск. Калі ўлада дзейнічае насуперак інтарэсам уласных грамадзянаў, ужывае гвалт і рэпрэсіі супраць беларускага народа, то гэта азначае, што яна чужынская, акупантская. Як мінімум, такую ўладу не трэба прызнаваць легітымнай. Менавіта такую мэту ставіў перад сабой Еўрасаюз, калі ўвёў санкцыі супраць чыноўнікаў, вінаватых ў збіцці людзей, пазбаўлення іх магчымасці спакойна вучыцца і працаваць. У спіс неўязных трапілі 158 чыноўнікаў РБ. Сярод неўязных у краіны Еўразвязу Аляксандр Лукашэнка і яго старэйшыя сыны, міністр абароны Ю. Жадобін, кіраўнік КДБ В. Зайцаў, генпракурор Г. Васілевіч, спікер “Палаткі” В. Андрэйчанка, 24 старшыні тэрытарыяльных выбарчых камісій, 30 суддзяў і 10 прапагандыстаў. Пытанне эканамічный санкцый пакуль застаецца адкрытым. Шчыра кажучы, дэмакратычная грамадскасць засталася расчараванай такой адпіскай еўрабюракратаў. Лукашэнку не палохаюць санкцыі ЕС, калі гэта толькі забарона на выезд у краіны Еўропы. Ды няхай будуць хоць 158 тысяч! Рэжым збівае нявінных, гнаіць людзей у турмах, а тут усяго толькі Лукашэнка не пакатаецца ў Альпах на лыжах? Ну паедзе ў Сочы (дзе ён і адпачываў два тыдні), а грошы “сямейкі” асядуць у афшорных зонах. Хай бы насамрэч неўязнымі зрабілі тысячы і тысячы буйных і дробных чыноўнікаў, якія сваімі рукамі рабілі брудную справу па фальсіфікацыі выбараў, цэлы тыдзень заганялі людзей на гэтак званае датэрміновае галасаванне, запалохвалі студэнтаў, рабочых і калгаснікаў. А які эфект быў бы, калі б далучылі да спісу і членаў іх сямей. Няхай бы жонкі чыноўнікаў, якія прывыклі адпачываць на швейцарскіх курортах ехалі на Нарач і плюхаліся там. Аднак падобныя праекты няжыццяздольныя. Дыктатарскі рэжым больш баіцца эканамічных санкцый, на якія ЕС не пойдзе, таму што сам яшчэ не ачухаўся ад фінансавага крызісу. Адзінае, што магло б дэмаралізаваць рэжым – гэта зрабіць неўязнымі артыстаў і спартоўцаў. Пры такім раскладзе эканоміка Беларусі не панесла б адчувальных страт, а вось па рэжыму і асабіста па Аляксандру Лукашэнку гэта быў бы моцны ўдар. Спорт для яго – гэта акно ў свет. Аналагічныя вопыт ужо ў гісторыі быў. У 1980 годзе два дзесяткі дэмакратычных краін байкатавалі Алімпіяду ў Маскве, у выніку чаго СССР канчаткова страціў і маральны аўтарытэт на міжнароднай арэне, і панёс фінансавыя страты ў 5 мільярдаў даляраў. Даўно даказана, што савецкія і постсавецкія рэжымы разумеюць толькі мову халоднай вайны. Размаўляць з імі на мове цывілізаванага свету, прытрымліваючыся еўрапейскіх стандартаў – марная страта часу.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## У ЦЭНТРЫ УВАГІ

# ЧАРГОВАЯ РАЗМОВА ПРА НАБАЛЕЛАЕ

Арыенціры і прыярытэты палітыкі нашай дзяржавы вызначаны Праграмай сацыяльна- эканамічнага развіцця Беларусі на 2011-2015 гады. Праграма прымушае прадстаўнікоў выканаўчай улады пастаяна праяўляць клопат пра насельніцтва. Аб гэтым сведчаць не толькі шматлікія заканадаўчыя дакументы, але і непасрэдныя сустрэчы з насельніцтвам, канкрэтныя рашэнні з улікам указаных прапаноў і заўваг. Каб быць бліжэй да людзей, з мэтай больш дасканалага вывучэння патрэб і праблем жыхароў раёна, у Шумілінскім райвыканкаме створана спецыяльная група ў саставе спецыялістаў і кіраўнікоў службаў раённага звяна. Плануюцца выезды ў сельсаветы, пасёлкі і вёскі, дзе і адбываецца інфармаванне грамадзян, вырашэнне праблем на месцах. Варта зазначыць, што ў Шумілінскім раёне жыхары могуць звярнуцца асабіста да кіраўніка райвыканкама праз прамую тэлефонную лінію і прыём па асабістых пытаннях. Цягам дзён інфармаванне праходзіла ў аграгарадку Слабада, пасля чаго старшыня Шумілінскага райвыканкама В. А. Падляшчук вырашыў асабіста прыняць удзел у размове з людзьмі. Сустрэча праходзіла ў памяшканні Слабадской сярэдняй школы. Па- сутнасці, гаворка вялася вакол пададзеных вяскоўцамі пісьмовых зваротаў і скаргаў, якія мясцовыя чыноўнікі зарэгістравалі, нешта паабяцалі, але дзейсных мер так і не прынялі. Паказчык актыўнасці, грамадзянскай пазіцыі на падобных сустрэчах звычайна вымяраецца колькасцю прысутных. А людзей на сустрэчу прыйшло шмат. Шмат ахвотных пагаварыць з кіраўніком раёна ў фармаце актыўнага дыялогу, абмеркаваць кожную пазіцыю дэталёва, з разуменнем і падтрымкай. Як прыклад, гучалі катэгарычныя патрабаванні жыхароў аграгарадка Слабада даць рэгулярны аўтобусны маршрут да Шуміліна, асабліва ў выхадныя дні, правесці газіфікацыю дамоў прыватнага сектара. Незадаволены вясковыя жыхары і тым, што фельчар мясцовага ФАПа не мае права выдаць хвораму бальнічны ліст. Выходзіць так, што хвораму з тэмпературай трэба неяк дабірацца да Шуміліна ў паліклініку, пераносіць хваробу на нагах і пасля атрымліваць ускладненні? І гэта ўлада такім чынам “клапоціцца” пра здароўе нацыі? Як звычайна, пераважная большасць пытанняў насіла камунальны характар, да гэтага дадалася і нарыхтоўка цвёрдага паліва, і будаўніцтва жылля, і развіццё сацыяльнай сферы. Больш таго, людзі абураліся на кіраўніцтва райспажыўтаварыства, якое закрыла ў Слабадзе прамтаварны магазін. Відавочна, зняць імгненна праблему і ў старшыні райвыканкама Вальдэмара Падлешчука не атрымалася, кіраўнік раёна растлумачыў вяскоўцам, у які тэрмін гэта адбудзецца і за якія рэсурсы. Пустых абяцанняў Вальдэмар Антонавіч,у адрозненне ад некаторых сваіх падначаленых, даваць не стаў. Давялося даваць грунтоўныя адказы. На жаль, аўтобусны рух Слабада-Шуміліна наладзіць не атрымаецца, таму што раён не мае сваёй аўтобуснай базы. У гэтым выпадку пытанне будзе распрацоўвацца. Наконт работы магазіна лягчэй: райспажыўтаварыству ўжо аддадзены загад да першага сакавіка прыняць меры па яго адкрыццю. Тым больш, што пакупнікоў хапае – у аграгарадку пражывае каля тысячы чалавек. Пытанне с выдачай бальнічных лістоў таксама вырашылася хутка, па камандзе кіраўніка раёна галоўны ўрач райбальніцы дазволіў загадчыцы Слабадского ФАПа выпісваць такія дакументы. Праўда, гэта пытанне ў кампетэнцыі Міністэрства аховы здароўя, але што рабіць, калі сітуацыя нестандартная і пакутуюць хворыя людзі? Разам з тым, ёсць адказнасць не толькі дзяржавы перад грамадзянамі, але і наадварот. Вальдэмар Падляшчук заўважыў, што пра газіфікацыю дамоў гаспадары і самі павінны клапаціцца. Так, у Слабадзе праведзены прыродны газ, а ў кожнага з жыхароў пасёлка ёсць магчымасць скарыстаць дзяржаўную падтрымку. На сённяшні дзень дзяржава кампенсуе 70% расходаў па газіфікацыі прыватнага сектара і дае льготныя крэдыты, каб насельніцтва змагло аплаціць астатнія 30% выдаткаў. Надалей кіраўнік райвыканкама распавёў прысутным аб сацыяльна-эканамічным развіцці нашага раёна. Тыя, хто скардзіўся на сціплыя заробкі, пачулі рэальныя разлікі эканамістаў. І сапраўды, адкуль браць грошы на годную зарплату, калі раён прадае дзяржаве ўсяго 5,89 л малака на карову? Для параўнання: сярэдні паказчык па вобласці – 7,71 літра. У прамысловай сферы выніковыя паказчыкі далёка не лепшыя. Хлеба райспажыўтаварыства выпякае толькі дзве тоны, а цэх безалкаголных напояў наогул закрыўся. Ёсць над чым працаваць і многа чаго можна дасягнуць, калі рабіць справу ў агульнай звязцы.

**Алесь Шумскі.**

## “СВІТАНАК” У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчацца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу “Пэрыёдыка” для далейшага выкарыстання яшчэ да з’яўлення газеты на паперы.**

## АБ’ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

## ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# Ці ўсе зімуюць у цяпле?

Да суворага надвор'я жыхары нашага раёна з большага падрыхтаваліся. Самыя прадбачлівыя і заможныя грамадзяне ўстанавілі ў дамах і кватэрах газавыя катлы, астатнія яшчэ летам запасліся мясцовымі відамі паліва. У гэтым годзе з-за халадоў ацяпляльны сезон пачаўся раней звычайнага. Нагадаем, што ў школах, дзіцячых садках, бальніцах ацяпленне ўключаецца, калі тэмпература паветра ніжэй за + 10 градусаў, а ў жылым фондзе – калі на вуліцы ніжэй за +8. Пры гэтым тэмпература ў памяшканні не павінна быць ніжэй за +18 градусаў цяпла. Такім чынам ужо з 1 кастрычніка былі ўключаны сістэмы ацяплення ў школах, дзіцячых садках, медыцынскіх установах і ўстановах сацыяльнага забеспячэння з пастаянным знаходжаннем людзей. Існуе меркаванне, што ў наш нялёгкі час можна вырашыць любую праблему, абы грошы былі. Аднак не будзем спяшацца з падобнымі высновамі. Чамусьці на Шуміліншчыне з году ў год вырашыць паліўнае пытанне гаспадарам прыватных сядзіб – тых, да якіх так і не падвялі "блакітнае паліва" – не ўдаецца нават і з грашыма. А з нарыхтоўкай дроў, хоць шумілінцы жывуць у раёне, амаль палова тэрыторыі якога пакрыта лясамі, узнікаюць праблемы. Насельніцтва абслугоўвае Шумілінскі філіял "Віцебскаблпаліва". Паводле дырэктара Уладзіміра Кійко, зараз вялікага ажыятажу няма – арганізацыя за месяц абслугоўвае каля паўсотні чалавек. Але чарга на дровы па-ранейшаму вялікая, у некалькі сотняў, на сённяшні дзень запісваюць толькі на канец красавіка. Так што тым гаспадарам, у якіх скончыўся запас дроў, не пазайздросціш. Застаецца яшчэ адзін выхад: звярнуцца ў лясгас, каб там выпісалі дзялянку, а затым нарыхтоўваць драўніну сваімі сіламі. Здавалася б, вясковым жыхарам лягчэй – каля кожнай вёскі расце шмат вольхі, такога дрэва, якое расце надта хутка. Але ў бліжэйшых лясных масівах высякаць дрэвы забаронена, таму найчасцей дзялянкі даюць далёка ад дома, а тут яшчэ ўзнікаюць праблемы з транспартам. А знойдзеш трактар – не так проста вывезці дровы з дзялянкі, дарог няма, трэць тэрыторыі раёна забалочана. Асабліва пакутуюць адзінокія пенсіянеры. Да прыкладу, як толькі справа блізіцца да восені, у нашу рэдакцыю пачынаюць тэлефанаваць знаёмыя ўжо бабулькі з бліжэйшых вёсак. Адной жанчыне сталага веку з вёскі Амбросавічы нядаўна прывезлі машыну драўніны з Шумілінскага філіяла. Пры ўсім тым, па папярэдняй аплаце павінны былі даставіць загадзя папіленыя чуркі. А прывезлі тоўстыя трохметровыя ствалы нейкага буралому старой вольхі і асіны, дзе-нідзе ўжо і прагнілыя. Машына дроў абыйшлася ў 350 тысяч рублёў, дадатковыя расходы па распілоўцы і колцы склалі яшчэ 100 тысяч. А бабуліна пенсія нямногім больш за 400 тысяч. Без дроў пенсіянерка не засталася, але ж як тапіць печ сырымі палкамі? Як бачна на практыцы і ў гэтым годзе забяспечыць насельніцтва паліvam на ўсе 100% не ўдалося. Між іншым, сітуацыя з паліvam у арганізацыях яшчэ больш складаная. Школьныя ўстановы, якія дагэтуль не былі пераведзены на газ, ацяпляюцца, вобразна кажучы, з калёс. Купляюць дровы ў лясгасе Башнеўская, Навікоўская, Ляжнёўская, Амбросавіцкая школы, Мікалаёўскі дзіцячы садок. Як толькі прывозяць дровы – адразу спальваюць у кацельні ці печках. Начальнік Шумілінскага аддзела адукацыі Пётр Спірыдонаў прызнаў, што ў "Віцебскаблпаліве" набыць паліва немагчыма – цэны там высокія, а грошай на папярэднюю аплату няма. Таму аддзел адукацыі сваімі сіламі распрацоўвае дзялянкі ў лесе і вывозіць (маюць тры трактары). За сезон трэба нарыхтаваць каля 3500 кубаметраў драўніны. Лясгас транспарт не дае, таму заключылі дагавор з льнозаводам. Падобнае становішча склалася і ў некаторых установах аховы здароўя. І грошай бракуе, і з транспартам праблемы. Дарэчы, фіксаваная цана на адзін кубічны метр дроў – 30 тысяч рублёў, адна тона торфабрыкету каштуе 85 тысяч, кавалкавага торфу – 40 тысяч. Прынамсі, сітуацыя з цвёрдым паліvam у нашым раёне парадаксальная. Будзем глядзець праўдзе ў вочы. Па словах галоўнага ляснічага Яўгена Філіпава, дровы – не самая першачарговая і не самая прыбытковая справа ў лясгасе. Хутчэй яны перашкаджаюць засяродзіцца на галоўнай задачы лясгаса – вытворчасці делавой драўніны. Таму звычайна на працягу працоўнага дня работнікі лясніцтваў займаюцца нарыхтоўкай дзелавой драўніны, а на зваротным шляху, каб не ганяць трактар парожнім, накідаюць у прычэп дроў. Тым не менш, дровы ёсць у дастатковай колькасці. Вось толькі не хапае адзінак тэхнікі. Адсюль і сённяшні паліўны "крызіс". Хоць ад такога тлумачэння арганізацыям і прыватным гаспадарам лягчэй не становіцца. Якое ж выйсце? Магчыма прыватны прадпрымальнік выправіць сітуацыю? Але прыватнае прадпрыемства "Флора дрэў" ( дырэктар Алег Судзько) зараз заказы не прымае, бо няма дзялянкі. Каб яе набыць, трэба ўзяць крэдыты ў "Беларусбанку". Без папярэдняй аплаты за тавар па крэдытах своечасова не разлічышся, а прадпрыемствы і арганізацыі на маюць грошай на гэты плацёж. Як разарваць замкнёнае кола?

**Алесь Шумскі.**

## КРЫМІНАЛ

# ГРАБЯЖЫ

Адзін мужчына, выхадзец з Пензенскай губерніі, вырашыў адпачыць у кафэ "Караван". Незнаёмая жанчына з г. п. Шуміліна справакавала яго на сварку, падчас якой непрыкметна зняла з шыі залаты ланцужок. Пацярпелы звярнуўся ў міліцыю. Супраць рабаўніцы ўзбуджана крымінальная справа.

***На жыхара вёскі Плігаўкі напаў мужчына з суседняй вёскі Цаўі. Нападнік пабіў вяскоўца і адабраў у яго сумку з гарэлкай. Цяпер яму прыйдзецца адказваць за хуліганства і грабёж.***

# АБАКРАЛІ БУДАЎНІКОЎ

**У Шумілінскі аддзел унутраных спраў звярнуліся работнікі ПМК-70. Як высветлілася, з будаўнічай пляцоўкі, што ў пасёлку Обаль, невядомыя злодзеі скралі сто метраў электрычнага кабелю. Прадпрыемству нанесены ўрон у паўтара мільёна беларускіх рублёў. Вядзецца вышук.**

## КУЛЬТУРНАЯ ПАДЗЕЯ

# В ШУМИЛИНО ВЫБРАЛИ СВОЮ КОРОЛЕВУ КРАСОТЫ

«Краса Минска» или даже «Краса России» отдыхают! В маленьком городском поселке Шумилино на севере Беларуси у них появился конкурент – здесь тоже учредили свой конкурс красоты с похожим названием – «Краса Шумилино». И девушки, которые состязались в красоте и талантах на сцене местного Дома культуры, были ничем не хуже столичных претенденток на звание «красы». А особенность шумилинского конкурса в том, что это был подарок мужчинам на День защитников Отечества.

В течение 15 лет в шумилинском РДК на 23 Февраля проходил КВН. Но в этом году решили отступить от традиции и подарить мужикам праздник красоты. А заодно и от других регионов не отстать: ведь конкурсы, где соперничают молоденькие девушки, есть уже даже в селах. Клич «Ищем красавиц!» бросили через местную «районку». От девушек требовались только возраст от 16 до 31 года и большое желание участвовать. Про знаменитые «90/60/90» и рост не ниже 175 см ничего прописано не было.

В итоге в первом в Шумилино конкурсе красоты рискнули принять участие шесть девушек. Некоторые из них ни за что «не вписались» бы в критерии отбора столичных конкурсов из-за невысокого роста или фигуры 48-го размера. Но зато креатива, задора, смелости у провинциальных красавиц было с избытком! Кстати, конкурс был зрелищным и великолепно организованным – корреспонденты «ННВ» были приятно поражены. Честно говоря, от городского поселка такого размаха мы не ожидали… Кстати, в РДК был аншлаг – на невиданное досель зрелище сюда шли целыми семьями. Билет стоил всего 10 тысяч рублей, немного даже по меркам райцентра.

Претендентки на корону «Краса Шумилино-2011» блистали в вечерних, коктейльных, свадебных платьях и деловых нарядах. Конкурсная часть программы состояла из четырех испытаний: девушкам нужно было представить оригинальный рассказ о себе, сделать необычный подарок городу, блеснуть умом и талантами в интеллектуальном и творческом конкурсах.

И соперницы, пусть их было и немного, старались превзойти друг дружку! 19-летняя Анна Ивановская (№2), инспектор отдела кадров районного узла электросвязи, разбила стереотип, изобразив из себя в визитке… «гадкого утенка». «Ну какая ты красавица? Нос не каждому понравится…» – например, поддевал девушку на сцене ее родной брат. Своему Шумилино она подарила диск с фотографиями улыбок его жителей. А в творческом конкурсе покорила зрителей чувственным танцем живота. И именно ей достался титул «Красы Шумилино», телевизор и слиток серебра от одного из банков.

Очень яркой была второкурсница факультета белорусской филологии и культуры ВГУ П. Машерова Анна Гаева (№4). Эта «девочка с детством в душе» тронула всех визиткой, где поведала все свои милые девичьи секреты плюшевому мишке. А ее хореографическая миниатюра в жанре танца-модерн на несколько мгновений вернула в воспоминания о витебском IFMC. В качестве презента родному городу Аня преподнесла красивую бутылку, которая… «исполняет желания». Кто-то из зрителей крикнул в бутылку: «Пусть в Шумилино наконец появится бассейн!» Подарок красавицы перешел на хранение в местный историко-краеведческий музей. Анна Гаева стала «Мисс очарование».

Помощнику воспитателя детского сада-яслей №3 Анне Соловьевой (№1) присудили звание «Мисс Стиль». Девушка запомнилась чтением стихов собственного сочинения. А в подарок Шумилино она написала даже оду. Всех рассмешил один из ее маленьких воспитанников. Мальчишка заявил, что мечтает стать председателем райисполкома!

Титул «Мисс Гармония» по праву достался младшему научному сотруднику местного Дома ремесел Любови Касьяновой (№5). У нее тоже был танец живота, правда, в отличие от А. Ивановской, это был танец соло. Ну а городским модницам Люба подарила наряды «от кутюр» – несколько платьев из бумаги, пластика и еще чего-то «нетканого».

Ну и наконец в Шумилино появилась своя Мэрилин Монро. Это продавец райпо Марина Жолудева (№6)! В творческом конкурсе девушка так вошла в образ американской актрисы, что, похоже, не хотела с ним расставаться. Ну а меня лично эта конкурсантка восхитила своим тортом в виде герба Шумилино! Всякому, кто хоть немного разбирается в кондитерском искусстве, понятно, насколько трудна в исполнении такая композиция – герб представляет собой архангела Михаила, который попирает змея… Поэтому жюри можно было бы смело лишить этого торта, если бы Марине не достался титул «Мисс Конгениальность».

Самой старшей конкурсантке – 24-летней Юлии Галузо (№3), первому секретарю райкома БРСМ – жюри отдало титул «Мисс Оригинальность». Хотя перед конкурсом в кулуарах шептались, что именно ей достанется победа. На это намекали и ее активность, и модельный рост (179 см), и слова в ее визитке «Юля стремится занимать первые места во всем, часто так и получается», и группа поддержки в зале с плакатами и бэрээсэмовским флагом. Родному городу секретарь райкома в лучших традициях своей организации подарила наглядную агитацию – огромный плакат с панорамой Шумилино и счастливыми детьми на первом плане. А в творческой номинации исполнила световой танец вместе с витебскими файерщиками.

В жюри входили только мужчины: местный идеолог, несколько руководителей предприятий, врач-стоматолог, представитель МЧС. А возглавлял жюри военный комиссар Шумилинского райвоенкомата Олег Чернявский. На церемонии награждения он сдержанно отметил, что этот конкурс подарил шумилинским мужчинам массу незабываемых впечатлений. Другой его коллега по судейской комиссии не удержался и пошутил: «Еще несколько таких конкурсов красоты – и в нашей стране нужно будет вводить многоженство». Еще один член жюри попросил участниц конкурса не уезжать из родного Шумилино. Но это вряд ли – встретится принц из какой-нибудь столицы, уж наверняка упорхнут!..

**Яна Ильина, "Народныя навіны Віцебска".**




***На снимке:*** Анна Ивановская, победительница конкурса.

**Фото Сергея Серебро.**

## НАША СПАДЧЫНА

# НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

Натхненне, як вядома, крочыць побач з плённай, штодзеннай працай. Такое жыццёвае крэда ўласціва майстрам з народнага клуба "Спадчына" Шумілінскага Дома рамёстваў. Днём, ноччу, раніцай і вечарам, у любую пару года майстар знаходзіцца ў творчым пошуку, аналізуе тыя ці іншыя ўражанні, імкнецца знайсці цікавае ў навакольным асяроддзі, каб потым праз прызму абстрактнага мыслення знайсці канчатковы вобраз. Каб падцвердзіць шумілінскаму калектыву ганаровае званне народнага, некалькі дзесяткаў умельцаў з райцэнтра і вёсак Мікіціха, Дабея і Мішневічы прынялі ўдзел у абласной выставе. Свае лепшыя аўтарскія работы ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры навуковай творчасці выставілі обальскія ганчары А. Любімаў і Я. Наважылаў. Іх вырабы: бачкі, керамічныя гаршчкі, гарлачыкі, міскі, адметныя тым, што адлюстроўваюць традыцыйныя для нашага краю формы посуду. Увогуле, нашы народныя майстры паўтараюць традыцыйныя асаблівасці мясцовай культуры. Ёсць карта раёна, з пазначанымі на ёй месцамі бытавання тых або іншых рамёстваў, фальклорных адметнасцяў. Існуе картатэка асноўных звестак аб народных промыслах нашага рэгіёна і іх найбольш яркіх прадстаўніках. Найбольш развіта на Шуміліншчыне лазапляценне, саломапляценне, вышыўка, падвойнае ткацтва, ласкутная тэхніка і г. д. Носьбіты сакрэтаў традыцыйных шумілінскіх відаў народнай творчасці прадстаўлены ў дзвюх залах. У межах абласной выставы "Прыйшлі святкі на калядкі" можна пабачыць усю разнастайнасць рамёстваў. Метадыст А. Быкава прапануе наведвальнікам вышыты льняны герб Шумілінщчыны. Акрамя таго, на першым плане вялікай залы красуецца дзявоцкі нацыянальны касцюм, які здаўна насілі ў раёне. Побач з дзявочым строем – куфэрак ручной работы. Народны ўмелец У. Каласкоў разам з вучнем Арцёмам Сянькоўвым прывезлі лазовы ветразь. Асобнае захапленне віртуознасцю чалавечых рук вымушаюць тэатральныя лялькі. Гэтыя аўтарскія праекты набылі папулярнасць у народным тэатры "Батлейка". Штодзённа на выставе бываюць больш за трох дзесяткаў гарадскіх гледачоў. Здзіўляць творчымі здабыткамі, упрыгожваць выставу сваімі вырабамі ў абласным метадычным цэнтры шумілінскія ўмельцы будуць да 18 сакавіка. Прыемна тое, што ў нашым раёне ёсць людзі, якія на сучасным этапе развіцця імкнуцца ізноў вярнуцца да сваіх этнічных беларускіх каранёў, культывуюць этнас і народныя рамёствы.

**Алесь Прыбярэжны.**

## ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# Лібія: Паўстанцы бяруцца за сталіцу

**ПАЎСТАНЦЫ, ЯКІЯ КАНТРАЛЮЮЦЬ УСХОДНІЯ РЭГІЁНЫ КРАІНЫ, ПАДЦЯГВАЮЦЬ СВАЕ СІЛЫ Ў БОК СТАЛІЦЫ, ЯКАЯ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў РУКАХ СІЛАЎ, ЛЯЯЛЬНЫХ КАДАФІ.**

### Баі за падыходы да сталіцы

Учора ішло змаганьне за гарады Завія, Місурата і Сабрата, якія знаходзяцца вакол Трыпалі. Найбольш зацяты бой меў месца ў Завіі, дзе ўрадавыя сілы, узброеныя аўтаматамі і зэнітным кулямётам, атакавалі мячэць, у якой бараніліся паўстанцы, узброеныя паляўнічымі стрэльбамі. Паводле некаторых данясеньняў, бой трываў чатыры гадзіны, і ў ім загінулі больш за 100 чалавек.

Тымчасам у сталіцы працягвалася пасьпешная паветраная эвакуацыя замежных грамадзянаў. Вашынгтон даў загад некаторым супрацоўнікам сваёй амбасады ў Трыпалі пакінуць краіну.

Паводле брытанскай газэты «Guardian», ня менш за палову лібійскага міжземнаморскага ўзьбярэжжа знаходзіцца пад кантролем паўстанцаў.

### Бін Лядэн і наркотыкі

Учора з тэлевізійным зваротам да жыхароў Завіі зьвярнуўся Муамар Кадафі. У прамове, якая трывала паўгадзіны і часам мела бязладны і блытаны характар, лібійскі дыктатар абвінаваціў Усаму бін Лядэна, кіраўніка Аль-Каіды, у падаграваньні паўстаньня, кажучы, што бін Лядэн адурманіў паўстанцаў «галюцынагеннымі таблеткамі ў каве з малаком».

Таго самага дня на лібійскім тэлебачаньні выступіў адзін з сыноў Муамара Кадафі, Сайф-аль-Іслам Кадафі, які сказаў, што жыцьцё ў Трыпалі працякае «спакойна». Іншы сын, Саадзі, сказаў у інтэрвію «Financial Times», што ў сталіцы «50-60 адсоткаў людзей працуюць нармальны», і паўтарыў за сваім бацькам, што пратэстоўцы дзейнічаюць пад уплывам «вельмі магутных» наркотыкаў, такіх як амфэтамін і экстазі.

### Падзеленая армія

Экспэрты лічаць, што сілы, якія бароняць Муамара Кадафі, былі сфармаваныя лібійскім лідэрам на працягу шматлікіх гадоў па-за арміяй і не кантралююцца ягонымі генэраламі. Мяркуецца, што гэтыя сілы складаюцца са спэцбрыгадаў, якімі камандуюць сыны Кадафі; вайсковых адзінак, сфармаваных на аснове клану Кадафі і яго саюзьнікаў; ды афрыканскіх наёмнікаў, якія маюць за сабою досьвед удзелу, сярод іншага, у грамадзянскай вайне ў Судане.

У лібійскай арміі батальёны наогул сфармаваныя з прадстаўнікоў аднаго клану, ляяльнасьць да якога большая, чым да камандзіраў. Кадафі гэткім чынам стараўся падзяліць армію, каб пазьбегчы вайсковага перавароту супраць сваёй асобы, падобнага да таго, пры дапамозе якога ён сам захапіў уладу ў 1969 годзе. Гэткая асаблівасьць арганізацыі лібійскай арміі давяла да таго, што некаторыя вайсковыя аддзелы перайшлі на бок паўстанцаў, як папярэдне зрабілі іхныя кланы.

Клан Кадафі кантралюе паветраныя сілы і мае большасьць сваіх прадстаўнікоў сярод вышэйшага афіцэрскага эшалёну ў арміі. Гэтыя афіцэры застаюцца яму вернымі, паколькі яны могуць страціць найбольш, калі Муамар Кадафі страціць уладу, піша сёньняшняе выданьне «International Herald Tribune».

**25.02.**
**“Радыё Свабода”.**

## ПРАБЛЕМЫ ЭКАНОМІКІ

# КУДА ПОДЕВАЛАСЬ НАША БОЛЬШАЯ ЗАРПЛАТА?

***Радость после предвыборного увеличения зарплат длилась, увы, недолго. И вот уже Беслстат сам констатирует: реальная зарплата снизилась в январе на 12,9%, «похудев» с 532 долларов в декабре до 468,2 долларов в январе. А разве кто-то обещал, что после выборов зарплата будет такая же высокая?***

Итак, согласно данным Белстата, реальная (с учетом инфляции) зарплата в январе 2011 года снизилась на 12,9% по сравнению с декабрем 2010 года.

Цифры также гласят: номинальная среднемесячная заработная плата в январе 2011 года составила Br1409,6 тыс. против Br1595,9 тыс. в декабре, сократившись на 11,7%, или на Br186,2 тыс.

Если же перевести наши зарплаты в доллары США, то от декабрьских 532 долларов в январе останется лишь 468,2 доллара. Такие вот невеселые метаморфозы.

На это в принципе можно было бы возразить, что подобное случается каждый год. Всевозможные декабрьские надбавки всегда значительно «обесценивают» следующую январскую зарплату. Но вот незадача: такого существенного снижения, как в этом году (на целых 12,9%!), за последние, даже кризисные периоды зафиксировано еще не было. Например, в январе 2010-го реальная начисленная заработная плата по сравнению с декабрем 2009 уменьшилась на 9,2%.

Как-то не вяжется все это с бравыми речами президента относительно возросшего благосостояния нашего народа. Наоборот процветающая Беларусь на глазах просто начинает увядать.

Хотя с другой стороны, а разве кто-то обещал, что и после выборов зарплата белорусов будет все те же 500 долларов?

Похоже, что мало кого удивило такое заметное «похудание» собственного кошелька. В этой связи, белорусы, наверное, чуть ли не единственная нация, которая не радуется очередному повышению зарплат, зная, какими последствиями это в результате обернется. И это еще лишь цветочки уже изрядно подвявшего процветания.

**Павел Дмитриев.**

## ДЭМАКРАТЫЧНЫ РУХ

# ЧАС ПАЗЫТЫЎНАЙ АЛЬТЭРНАТЫВЫ

***20 сьнежня мы прачнуліся ў іншай Беларусі. Спадае дурман перадвыбарчых абяцанак рэжыму, усё больш людзей усьведамляюць глыбіню сыстэмнага крызісу, у якім знаходзіцца краіна. Павальна растуць цэны, якія ўжо «зьелі» ўсе дасьнежаньскія падвышкі заробкаў, стыпэндыяў ды пэнсіяў. А ўлада зноў заганяе дзяржаву ў стан ізаляцыі ад цывілізаванага сьвету і працягвае кампанію дзяржаўнага тэрору супраць дэмакратычнай часткі грамадзтва. Пагроза страты спачатку эканамічнай, а пазьней і палітычнай незалежнасьці па-ранейшаму вісіць над Беларусьсю.***

**Аляксандар Мілінкевіч**

**«Мадэль, пабудаваная Лукашэнкам, ня мае ніякіх пэрспэктываў»**

Наш народ усё больш становіцца закладнікам хваравітай спробы ўтрымацца ля ўлады любым коштам з боку аднаго чалавека, якому даўно пара на адпачынак. Мадэль, пабудаваная ім, ня мае ніякіх пэрспэктыў. Краіне як паветра патрэбныя перамены.

Ці можа сёньня дэмакратычная апазыцыя захапіць палітычную ініцыятыву і пакласьці канец рэжыму, занепад якога бачны нават школьнікам? Не, пакуль ня можа. Але яна здольная гэта зрабіць пры ўмове, што выпрацуе прывабнае, зразумелае і пераканаўчае для бальшыні беларусаў бачаньне краіны і будзе пасапраўднаму народнай.

Сёньняшні стан рэчаў у апазыцыі можна акрэсьліць як ашаломленасьць, пахмельле пасьля эйфарыі ды ілюзій і пэўную дэзарыентацыю. Да гэтага, у прыватнасьці, спрычыніліся далёка ня лепшыя паводзіны некаторых саманадзейлівых лідэраў, якія, з розных прычын, своеасабліва павялі сябе ў час выпрабаваньняў.

Па-чалавечы, гуманістычна, можна і трэба зразумець, дараваць ім, але палітычна плянка заўсёды павінна быць высокай — гэта ў інтарэсах нашага народа і будучыні краіны. Бо заніжаная плянка вядзе да дэградацыі ды ўсёдаравальнасьці. А ў палітыцы трэба навучыцца адказваць за свае заявы, дзеяньні, хаўрусы ды сродкі, якія атрымліваеш, асабліва калі яны зь «невядомых» крыніцаў і іхняя задача — наняць палітычных шабашнікаў на цьмяныя эгаістычныя або небеларускія мэты.

Сытуацыя 2006 году таксама была няпростай, але іншай. Жорсткі перасьлед у час збору подпісаў і агітацыі. Галоўныя сілавікі па БТ папярэджвалі, што будуць разглядаць Плошчу як збор тэрарыстаў. Адміністрацыйных арыштаў, звальненьняў з працы і выключэньняў з універсітэтаў тады было значна болей, чым цяпер. Апазыцыя, як і ў 2001-м, вылучыла адзінага кандыдата. Што праўда, вельмі позна, меней чым за паўгода да дня выбараў. І аб'яднаньне было няпоўным. Частка дэлегатаў не прызнала рашэньне Кангрэсу дэмсілаў. Але ўсё ж каманда «адзінага» налічвала больш за пяць тысяч актывістаў, і яны актыўна адпрацавалі ў абсалютнай большасьці раёнаў.

Плошча была магутнай — па-над 30 тысяч мужных грамадзянаў. Галоўнае — быў адзіны сцэнар. На ўсіх сходах і на тэлебачаньні я казаў: «Рэальных выбараў няма, у дзень галасаваньня — на Плошчу. Абяцаю, што яна будзе мірнай». Мы ведалі, што толькі мірная Плошча мае шанец на прыход новых людзей, і не плянавалі паходы па горадзе.

Бо толькі мірная Плошча давала шанцы на прагрэсіў колькасьці маніфэстантаў у наступныя дні і на пераможны вынік.

**Старыя партыйныя кіраўнікі сказалі: «Нам не патрэбны адзіны лідэр, мы ўсе лідэры»**

Тым ня менш пасьля тых выбараў у большасьці дэмакратаў не было пачуцьця паразы. Мы даказалі, што ёсьць свабодная Беларусь. Была вера, што гэта толькі першая стратэгічная прыступка для Аб'яднаных дэмакратычных сілаў.

Дзякуючы Плошчы паўсталі БЕЛСАТ і радыё «Рацыя». Была заснавана польская праграма падтрымкі рэпрэсаваных студэнтаў імя К.Каліноўскага. Практычна ўсе адлічаныя «за палітыку» з ВНУ атрымалі магчымасьць працягнуць навучаньне ва ўнівэрсытэтах сямі краінаў Эўропы. Гэта разбурала страх у моладзі. Што праўда, значна меншымі былі нашыя посьпехі па працаўладкаваньні палітычных беспрацоўных у Польшчы і ў нашай краіне.

Мы спрабавалі аб'яднаць у дзейнасьці шматлікіх новых актывістаў, якія складалі абсалютную большасьць на Плошчы, абвясьціўшы аб стварэньні руху «За свабоду», які меўся аб'яднаць усіх прыхільнікаў переменаў у краіне на агульнай пазапартыйнай пляцоўцы. Эўразьвяз вітаў мірную спробу пратэсту, у тым ліку праз прысуджэньне тагачаснаму адзінаму кандыдату ад апазыцыі прэміі Эўрапарлямэнту «За свабоду думкі» імя Андрэя Сахарава.

Аднак арыентацыя на Ўсход і зайздрасьць партыйных босаў, якія думалі перадусім пра абарону сваіх вотчынаў ад эфэмэрнага «рэйдэрскага захопу», прывялі да Кангрэсу-2007 і рашэньня аб ратацыйным кіраўніцтве АДС. Як казалі ў той час старыя партыйныя кіраўнікі: «Нам не патрэбен зараз адзіны лідэр, мы ўсе лідэры».

ГалоўнымгалаўнымболемАДСныхі«ратататараў» стаў не рэжым, а былы адзіны кандыдат, які за кароткія тэрміны атрымаў добрую вядомасьць у краіне і за мяжой. Наш заклік абраць на гэтым Кангрэсе аднаго ці новага, ці старога лідэра для рэальнай супольнай працы быў заблякаваны. Здабытак 2006 году расьцерушыўся ўсімі намі. З вышыні сёньняшняга дня відавочна, што ратацыйная безадказнасьць і прывяла да «параду кандыдатаў» на выбарах-2010.

Не шкадую аб маім рашэньні, якое я абгрунтаваў нежаданьнем гуляць у чужыя сцэнары, дзе толькі адзін актор, рэжысэр і пастаноўшчык. Ведаю, што ў значнай часткі актывістаў было расчараваньне і неразуменьне майго кроку. Яшчэ раз прашу прабачэньня ў маіх прыхільнікаў. Але час паказаў, што маё рашэньне было правільным.

Пра Плошчу. Адзіная пераможная стратэгія Плошчы ў варунках канцэлдаванага дыктатарскага рэжыму — гэта паступовае нарастаньне мірнага пратэсту. Перад Плошчай 2010 году шмат хто ня раз казаў: мы пойдзем да канца, мы не паўторым памылак мінулай кампаніі. Нядахоп мінулай кампаніі — гэта недастатковa вялікая колькасьць пратэстоўцаў, а не адсутнасьць радыкальных дзеяньняў. Так, калі ёсьць упэўненасьць у сваёй перамозе, калі адчуваеш, што яе скралі, калі на вуліцы выходзіць пераможная колькасьць выбарцаў, тады належыць дзейнічаць рашуча і наступальна.

Пры гэтым павінен быць адпаведны плян з ацэнкай рызыкаў і мэханізмамі, каб іх пазьбегаць. А калі большасьць не за табой, калі няма аднаго канкрэтнага пляну, калі няма добра наладжанага кантролю за паводзінамі натоўпу, дзе заўсёды хапае правакатараў, дык тады ты не суб'ект, а аб'ект. Cui prodest, хто найбольш скарыстаў зь няўдалай Плошчы-2010 і дзяржаўнага тэрору? Адказ ясны для кожнага: тыя сілы, якія ня хочуць унутранага грамадзкага дыялёгу да эўрапейскай інтэграцыі Беларусі. Як з Усходу, так і ўнутры краіны.

**«Мы ўсе сталі сьведкамі страху і разгубленасьці рэжыму»**

Але сьнежаньскія падзеі паказалі, што ў краіне ёсьць нязломны грамадзянскі дух, што шмат хто гатовы адкрыта дэманстраваць сваю маральную і канкрэтную салідарнасьць з ахвярамі рэжыму, што беларусы могуць, калі трэба, самаарганізавацца, каб дапамагаць тым, хто патрапіў пад рэпрэсіі карных органаў. Гэта той здабытак, які нам трэба памнажаць.

Мы ўсе сталі сьведкамі страху і разгубленасьці рэжыму. Бо ўпэўнены ў сабе кіраўнік будзе шукаць згоды і кампрамісу, а не раскалваць грамадзтва і цкаваць нязгодных. Мы пабачылі, што хцівыя ідэолягі няздольныя без дручкоў апрычнікаў-амапаўцаў перамагаць у дыскусіях. Мы яшчэ раз пераканаліся, што сёньняшні рэжым ня можа дэмакратычна, бяз гвалту выйграць выбары.

Таму нам трэба працаваць далей. Найперш быць адзінымі ў словах і справах па вызваленні палітвязьняў. Гэта прыярытэт нумар адзін. Але нельга забывацца пра іншую, арганічную працу, безь якой мы ня маем шанцаў на перамогу: пашыраць кола прыхільнікаў, спрыяць беларусам у кантактах з цывілізаваным сьветам, наблізжаць момант, калі абсалютная бальшыня нашых людзей убачыць безпэрспэктыўнасьць цяперашняй сыстэмы і запатрабуе свабодных і справядлівых выбараў, свабоды ў эканоміцы, вольнага слова ды пашаны да роднае мовы.

Лічу, што палітычная апазыцыя павінна менш зацыклівацца на пачуцьцях «супраць». Яна пакуль ня стала ў вачах беларусаў пазытыўнай альтэрнатывай. Я за тое, каб у нас дамінавала слова «за». А галоўная наша перамога адбудзецца пасьля таго, як мы пераможам у розумах і сэрцах нашых людзей.

*(Пададзена ў скарачэньні)*

## ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗАКЛАДНІКІ

# Міхалевіч: Мяне катавалі ў СІЗА КДБ

КАНДЫДАТ У ПРЭЗІДЭНТЫ АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ 28 ЛЮТАГА НА ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫІ Ў МІНСКУ РАСПАВЁЎ, ШТО ПАДВЯРГАЎСЯ КАТАВАННЯМ У СІЗА КДБ. ТАКСАМА ЁН РАСКАЗАЎ, ШТО ЎМОВАЙ ВЫЗВАЛЕННЯ З СІЗА БЫЛА ПАДПІСКА АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ З КДБ.



«СІЗА КДБ ператварыўся ў канцэнтрацыйны лагер у цэнтры Мінска», — з такіх словаў пачалася шараговая прэс-канферэнцыя Руху за Свабоду, на якой нечакана з'явіўся экс-кандыдат у прэзідэнты і былы вязень «амерыканкі» Алесь Міхалевіч.

«Я павінен расказаць аб усім, павінен выканаць свой грамадзянскі абавязак, — працягваў Міхалевіч. — Адразу пасля затрымання мне ва ўльтыматыўнай форме было загадана выступіць па БТ з заявай, у якой я б асуджаў Плошчу. Калі я адмовіўся, мяне змясцілі ў камеру. А праз некалькі дзён пачаліся катаванні».

Міхалевіч расказаў, што асабліва жорсткія пыткі адбыліся з ім 10 студзеня — палітыку заводзілі рукі за спіну, надзявалі кайданкі, а потым падымалі рукі ўверх. Пры гэтым патрабавалі неабходных паказанняў. Менавіта пасля такіх працэдур Алесь пазваніў жонцы і папрасіў нікуды не ездзіць. «Аднак я ўдзячны Мілане, што яна зрабіла тое, што зрабіла», — кажа ён.

Алесь таксама перакананы, што падобныя здзекі прымяняліся і ў дачыненні да іншых вязняў КДБ: «Катаванні паўтараліся неаднаразова. Я думаю, што іншыя палітвязні таксама маглі стаць іх ахвярамі».

Праз два месяцы ламання Алеся вызвалілі пад падпіску аб нявыездзе, аднак з умовай стаць «сексотам». «Мне далі на подпіс паперу, дзе я пагадзіўся супрацоўнічаць з КДБ. Я падпісаў яе і выйшаў на свабоду. Выйшаў для таго, каб усё гэта вам расказаць. Лічу сваю заяву публічнай адмовай ад супрацоўніцтва са спецслужбамі», — заявіў Міхалевіч.

Заява

Нягледзячы на тое, што я, Алесь Міхалевіч, экс-кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, звязаны падпіскай аб неразгалошванні таямніцы следства, я лічу, што мушу распавесці пра тое, што адбываецца з затрыманымі вязьняміі ў СІЗА КДБ; Галоўная «таямніца следства» — гэта метады, якія ўжываюцца для таго, каб змусіць людзей падпісаць вымаганыя ад іх паказанні і дэкларацыі. Я лічу, што супрацьзаконныя дзеянні, якія парушаюць не толькі беларускае заканадаўства, але і міжнародныя дамовы, такія як Міжнародная канвенцыя супраць катаванняў, нельга прыкрываць «таямніцай следства».

Я адмовіўся зачытаць для ТБ заяву асуджэння іншых кандыдатаў. Выклікі да супрацоўнікаў КДБ пачаліся з першых гадзін затрымання, вяліся без адваката, пратакола, з парушэннем усіх працэсуальных нормаў. Прыблізна з 26 снежня, у адносінах да мяне пачалі прымяняцца дзеянні, якія з'яўляюцца катаваннем.

Пры выхадзе з СІЗА КДБ у мяне канфіскавалі дзённік, які я там вёў штодня, але тое, што адбылося, немагчыма сцерці з памяці. Асобныя факты пералічаныя ў дакуманце ніжэй.

Па ўрыўках фразаў, пачутых з-за дзвярэй, я зразумеў, што падобныя дзеянні прарабляюць і з іншымі актывістамі, якія адмаўляюцца даваць вымаганыя ад іх паказанні; Адвакатаў не дапускаюць толькі таму, каб зняволеныя не маглі паведаміць пра факты катаванняў. Я непакоюся пра лёс усіх вязняў, асабліва тых, якія не мелі сустрэчаў з адвакатамі з канца мінулага году. Я разумеў, што тое, што з намі робяць, скіравана на ламанне апазіцыйных лідараў. Для мяне выбар быў паміж двума варыянтамі: альбо застацца пад вартай да суду, альбо зрабіць выгляд, што я згодны выконваць патрабаванні супрацоўнікаў КДБ.

Я адкрыта заяўляю, што ніколі не быў і не буду агентам Камітэта дзяржаўнай бясьпекі! Сваёй публічнай заявай я здымаю з сябе абавязак, які быў пазначаны ў паперы.

Я разумею, што ўжо да канца гэтага дня я магу патрапіць назад у СІЗА, і што стаўленне да мяне на гэты раз будзе непамерна' больш жорсткім; Але я хачу зрабіць усё магчымае, каб выратаваць тых, хто яшчэ застаецца за кратамі, каб аблегчыць лёс гэтых людзей, каб спыніць катаванніі; Я хачу каб у іх была магчымасць выйсці на свабоду не зламанымі, не стаўшымі на шлях супрацоўніцтва, а перадусім проста жывымі.

У сваім выступе я адмыслова не раскрываю імёнаў супрацоўнікаў і іншых акалічнасцяў следства; Але ўсе незаконныя дзеянні ў адносінах да мяне, разам з указаннем канкрэтных фактаў, я выклаў у заяве, якую накіроўваю ў Пракуратуру, а таксама ў форме, якая будзе накіравана спецдакладчыку ААН па праблеме катаванняў.

Лічу, што пракуратура мусіць правесьці праверку і спыніць зверствы.

Разам з тым, я зрабіў падрабязнае апісанне ўсяго, што са мной адбывалася, і накіраваў на захаванне ў надзейнае месца; Гэтыя сведчанні з'явяцца ў публічнай прасторы, у выпадку калі мяне зноў затрымаюць і змесцяць пад варту;

Я зраблю ўсё магчымае, каб знік канцлагер у цэнтры Мінску."

**Алесь Пілецкі, «Наша Ніва» ( у скарачэнні)**

# СПОСАБЫ ЗДЗЕКАЎ. «АМЕРЫКАНКА»

1. 10 студзеня "ахоўнікі ахоўнікаў" — людзі ў чорных масках без апазнавальных знакаў -вывалаклі з камеры, сілай пачапілі кайданкі ззаду, паднялі іх так, каб апусціць тварам да бетоннай падлогі. Спусцілі па вінтавой лесьвіцы ў падвальнае памяшканне. Сказалі, выварочваючы рукі за спіной максімальна высока ўверх, пакуль не пачалі хрусцець суставы, што я павінен выконваць усё, што ад мяне патрабуюць. Трымалі рукі падвешанымі за кайданкі доўга і падымалі вышэй і вышэй, пакуль не сказаў, што буду выконваць усё. Супрацоўнікаў ізалятара пры гэтым не было нават на калідорах.

2. Сістэматычна — па 5–6 разоў на суткі — выводзілі «на обыск» — на асабісты дагляд. Падчас гэтага ставілі голымі «на расцяжку», падсякаючы ногі амаль да поўнага шпагата. Калі падсякалі ногі, адчувалася, як ірвуцца звязкі. Ставілі голымі на адегласці каля метра ад сцяны, прымушаючы абаперці рукі на сцяну, у памяшканні, дзе тэмпература не перавышала 10 градусаў. Трымалі так па 40 хвілін, пакуль не ацякалі рукі. Некалькі разоў патрабавалі, каб рукі клаў на сцяну далонямі навонкі і так стаяў.

3. Падчас так званага асабістага дагляду ўсіх выганялі ў халоднае памяшканне распранутымі дагала і прымушалі выконваць рэзкія прысяданні па некалькі дзясяткаў разоў. Вязням са слабейшым здароўем падчас гэтага рабілася кепска, але "людзей" у масках гэта не спыняла.

4. На ноч не выключалі дзённае святло, патрабавалі класціся тварам пад лямпу, забаранялі накрываць твар хусткай, «чтоб відеть ліцо». У выніку пачаў псавацца зрок. Загадвалі спаць, павярнуўшыся тварам да «вочка» ў дзвярах, за гэтым сачылі бесперапынна — калі ты паварочваўся ў сне, заходзілі і будзілі, прымушаючы легчы, як загадана. Фактычна гэта вылівалася ў катаванне адсутнасцю сну.

5. Фарбавалі падлогу ў камеры фарбай на ацэтоне, і патрабавалі знаходзіцца ў памяшканні, якое фактычна не праветрывалася, да поўнага высыхання фарбы. Такое ўздзеянне доўжылася болей за сорак гадзінаў запар.

6. У саміх камерах тэмпература не перавышала 10 градусаў, ацяпленне практычна не было. На сцяне была чорная плесня, якая разрасталася, калі зачынялі фортку. Паведамілі, што мая камера павінна хадзіць да доктара толькі па чацверах (замест прапісанай у правілах магчымасці наведаць па запатрабаванні). Падчас вымярэння ціску доктар забараняў вязню глядзець на апарат, каб той, каму мераюць ціск, не бачыў паказанні. Запісваў гісторыю хваробы ў журнал, зачыняючы яго паперкай. Выганялі на прагулку ў мароз усіх, нават тых, хто запісаўся да доктара, не кажучы пра тых, у каго не было цёплых рэчаў.

7. Не пускалі адваката, хаця вольныя памяшканні заўсёды былі — мы бачылі пустыя кабінеты па дарозе на ўласныя допыты. (Ніхто з нас не атрымаў магчымасці сустрэцца з адвакатам сам-насам. Гэта было зроблена адмыслова, каб пазбавіць магчымасці распавесці пра катаванні).

## СВЕТ ПРА БЕЛАРУСЬ

# ВСЮ КАРТИНУ ИСПОРТИЛ ПОДСЧЕТ ГОЛОСОВ,

## А НОЧЬ ПОСЛЕ ВЫБОРОВ ПОДОРВАЛА ДОВЕРИЕ К НИМ

Как говорится в итоговом докладе миссии наблюдателей Бюро по демократическим институтам и правам человека ОБСЕ, который опубликован 22 февраля, президентские выборы 19 декабря 2010 года в Беларуси были отмечены «нехваткой независимости и беспристрастности избирательных комиссий», неравными условиями кандидатов и дефицитом прозрачности в ключевых стадиях избирательного процесса.

«Ночь после выборов была омрачена задержанием почти всех кандидатов в президенты, а также сотен граждан, среди которых журналисты, правозащитники и представители гражданского общества», — говорится в докладе. В нем также отмечается, что большинство задержанных участников «несанкционированной, как объяснили белорусские власти, акции» были приговорены судами к административным арестам и штрафам. Кроме того, было возбуждено уголовное дело по факту массовых беспорядков.

«Все эти обстоятельства подорвали доверие к выборам», — говорится в заключении миссии.

Остается проблемой качество и точность избирательных списков, так как не существует централизованного и компьютеризированного регистра.

По сравнению с предыдущими избирательными кампаниями БДИПЧ отмечает улучшения, так как кандидаты имели возможность беспрепятственно общаться с избирателями, но не было равных условий между девятью альтернативными кандидатами и действующим президентом, который использовал административный ресурс.

Кроме того, по мнению миссии, государственные СМИ при освещении избирательной кампании не были объективны и независимы. Негосударственные печатные и электронные СМИ стали для избирателей важным источником информации о кандидатах.

В докладе отмечается, что в Беларуси нет эффективного механизма подачи жалоб в ходе избирательной кампании или обжалования результаты выборов в Верховном суде.

Отмечая некоторые улучшения как в процедуре досрочного голосования, так и непосредственно в день выборов, БДИПЧ подчеркивает, что всю картину испортил подсчет голосов, который международные наблюдатели характеризуют как «плохой или очень плохой» почти на 75% посещенных ими участков. «Подсчет голосов проводился в тишине, в нетранспарентной манере, что серьезно ставит под сомнение результат», — говорится в докладе.

**Татьяна Коровенкова, БелаПАН.**

## САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЫТАННІ

# ОТ ЧЕГО И ПОЧЕМУ НАДО ЗАЩИЩАТЬ БЕЛОРУССКИХ МУЖЧИН

В ДЕНЬ ЗАЩИТНИКОВ ОТЕЧЕСТВА «ЗАВТРА ТВОЕЙ СТРАНЫ» ИЩЕТ ОТВЕТ НА ВОПРОС: КАКИЕ ОНИ, БЕЛОРУССКИЕ МУЖЧИНЫ, ОТ ЧЕГО И ПОЧЕМУ ИХ САМИХ СЛЕДУЕТ ЗАЩИЩАТЬ.

**Мужчины в Беларуси на вес золота**

За последнее десятилетие структура населения по полу ухудшилась из-за более высокого темпа роста смертности мужчин, особенно в трудоспособном возрасте. И вот результат — по данным переписи населения 2009 года в Беларуси проживало 4 млн. 420 тыс. мужчин и 5 млн. 84 тыс. женщин. На тысячу мужчин в Беларуси приходится 1.150 женщин.

Мужчины меньше живут. По данным Минтруда, в последние два года показатель ожидаемой продолжительности жизни в Беларуси составил у мужчин — 64,7 года, у женщин — 76,5.

В 2009 году в Беларуси было зарегистрировано 810 тысяч вдов, а их доля в общей численности женщин в возрасте от 15 лет и старше составила 18%. По сравнению с данными переписи населения 1999 года численность вдов увеличилась на 5,4%, или 40,2 тысячи человек.

**«Если жизнь излишне деловая, функция слабеет половая»**

Это из «Гариков на каждый день» Игоря Губермана. Белорусские мужчины много берут на грудь. Имеются в виду не только крепкие напитки, а ответственность, прежде всего. В результате — синдром менеджера и неоправданные ожидания. Появляются неврозы, сексуальные расстройства.

По оценкам специалистов, примерно 15—16% супружеских пар в Беларуси бесплодны. В последние годы отмечен значительный рост мужского бесплодия. Если 30 лет назад на 60—80% случаев женского бесплодия приходилось 20—40% мужского, то теперь это соотношение составляет 50% на 50%.

Координатор программ Фонда ООН в области народонаселения в Беларуси (ЮНФПА) Татьяна Гапличник говорит:

— Организм мужчины рано или поздно дает сбой, если его воспринимают только как добытчика и не считаются с его психологическими и физическими потребностями. Важно, чтобы в семье не формировались гендерные стереотипы, то есть мальчикам не внушали, что они не имеют права на проявление чувств, на слезы и так далее. В числе прочего из-за этого они вырастают людьми, которые не способны выражать чувства, следить за своим здоровьем. В Беларуси вообще мало обращают внимание на мужское здоровье. Хотя это важная составляющая демографической проблемы. Критичным становится тот факт, что общество не обращает внимания на здоровье мужчин, а мужчины считают себя здоровыми, несмотря ни на что. К тому же с проблемами мужского здоровья особо некуда обратиться. Если у женщин есть гинеколог, то у мужчины — только уролог. Если девочки могут пойти к детскому гинекологу, мальчики – только к педиатру.

**Белорусские мужчины немножко советские**

Хоть и живем мы в центре Европы, но мужчины, выросшие в независимой Беларуси, только-только вступают в самостоятельную жизнь. Вот почему так сильны еще стереотипы, сформированные в советские времена, считает председатель правления МОО «Гендерные перспективы» Ирина Альховка.

— Мужчины в Беларуси имеют убеждение, что они добытчики, должны обеспечивать семью. Для кого-то это непомерный груз. А отказаться от него – значит, признать себя слабым, -- приводит пример эксперт.

-- На Западе давно считается нормальным распределение обязанностей в семье, когда мужчина не считает зазорным помогать по дому и даже уходить в декретный отпуск. Не зря в английском языке есть слово, обозначающее мужчину в декретном отпуске.

В Западной Европе отпуск по уходу за ребенком берут даже мужчинами, занимающие высокие посты. В Беларуси отважных отцов, готовых уйти в декрет, всего около двух тысяч.

— Отличие белорусских мужчин от европейских в том, что традиционно домашние обязанности они считают женскими. Даже если заработок мужа меньше заработка жены, и семья с его уходом в декрет много не потеряет, все равно такое решение дается нелегко, -- поясняет эксперт.

Белорусские мужчины отличаются от европейских и тем, что они подвержены алкоголизму. И еще одна проблема — возникшие вопросы, как правило, решаются через насилие.

— Европейцы владеют информацией, как решать проблемы ненасильственным путем. Белорусам ненасильственные методы коммуникации мало знакомы, -- считает Ирина Альховка. -- Это нередко происходит потому, что у нас очень четкое распределение ролей — женщина-хозяйка, а мужчина-добытчик. Сила чаще всего считается признаком мужественности. Уход и избегание конфликта — признак слабости. В результате популярными являются агрессивный бизнес, агрессивная рекламная компания, агрессивный подход к решению проблем.

**Виктор ЛИСТОПАДОВ.**

**Заснавальнік:** Сяржук Салодкі
**Рэдактар:** Аляксандр Шчамлёў

**Адрас рэдакцыі:** 211262, Шумілінскі раён, п/а Амбросавічы.
Тэл. 3-73-74, маб. +375299870742

**Наклад:** 290 асобнікаў.
Выдаецца пры падтрымцы сяброў.
Распаўсюджваецца бясплатна